Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар УА «Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
____________ Ю.П.Бондар
«____» ___________2013 г.
Рэгістрацыйны № ВД-____/вуч.

# ГІСТОРЫЯ МАСТАЦТВА ЭСТРАДЫ
# Раздзел 2. ГІСТОРЫЯ СУСВЕТНАГА І БЕЛАРУСКАГА ДЖАЗА

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-17 03 01 Мастацтва эстрады*
*(па напрамках)*

Мінск
БДУКМ
2013

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Складальнік**

*І.А. Смірнова,* загадчык кафедры мастацтва эстрады ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

**Рэцэнзенты:**

*А.Л. Капілаў,* рэктар прыватнай установы адукацыі «Інстытут сучасных ведаў імя А. Шырокава», кандыдат мастацтвазнаўства, прафесар;

*В.П. Пракапцова,* загадчык кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар мастацтвазнаўства, прафесар

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

*кафедрай* мастацтва эстрады ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 7 ад 12.04.2012 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 24.05.2012 г.)

Адказны за рэдакцыю *А.І. Гутарава*

Адказны за выпуск *І.А. Смірнова*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна «Гісторыя сусветнага і беларускага джаза» з’яўляецца другім раздзелам вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя мастацтва эстрады» і знаходзіцца ў цесным узаемадзеянні з іншымі яе раздзеламі – «Гісторыя сусветнага і беларускага эстраднага музычнага мастацтва», «Гісторыя сусветнага і беларускага эстраднага музычнага тэатра», «Гісторыя сусветнага і беларускага эстраднага і джазавага выканальніцтва», мае дачыненне да дысцыплін «Сучасныя стылі джазавай музыкі», «Спецінструмент», «Імправізацыя на спецінструменце», «Аркестравы клас», на якіх здзяйсняецца прынцып інтэграванага вывучэння джаза як віду музычнага мастацтва, часткі сусветнай і беларускай музычнай культуры.

Асноўная *мэта* дысцыпліны – набыць уменні аналізаваць стылі, формы і жанры джазавай музыкі, тым самым пашырыць базавую музычную адукацыю студэнтаў, неабходную для грунтоўнай падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў названых напрамкаў у галіне джазавай музыкі.

*Задача* дысцыпліны – навучыць навыкам правядзення аналізу музычных твораў і стылявых кірункаў джаза.

У выніку засваення дысцыпліны выпускнікі павінны *ведаць:*

– генезіс і этапы развіцця сусветнага і беларускага джаза;

– моўныя асаблівасці і сродкі выразнасці стылявых напрамкаў джаза;

– спецыфіку галоўных жанраў джаза;

– творчасць лепшых выканаўцаў сусветнага і айчыннага джаза;

*умець:*

– асэнсоўваць і аналізаваць моўныя асаблівасці джаза,

– вызначаць спецыфіку музычных стыляў джаза;

– выяўляць і аналізаваць каноны музычных форм і жанраў джаза;

– на практыцы ўстанаўліваць сувязь паміж мастацкімі заканамернасцямі выконваемай джазавай музыкі, яе тэарэтычным аналізам і праблемамі выканальніцтва.

Такім чынам, будучым дзеячам эстрады прапануецца авалодаць ведамі па гісторыі і тэорыі джаза, набыць навыкі і ўменні асэнсоўваць і аналізаваць спецыфіку стыляў, жанраў і моўных асаблівасцей джаза, што дазволіць ім на практыцы ўстанавіць сувязь паміж мастацкімі заканамернасцямі выконваемай джа-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

завай музыкі, яе тэарэтычным аналізам і праблемамі выканальніцтва.

Вывучэнне раздзела «Гісторыі сусветнага і беларускага джаза» грунтуецца на двух метадах навучання. Першы абумоўлены задачамі рознабаковага музычнага развіцця студэнтаў і прадугледжвае засваенне джаза ў гісторыка-тэарэтычным аспекце: вытокі, спецыфіка фарміравання, асноўныя этапы і тэндэнцыі развіцця, стылявыя напрамкі, жанры, формы і інш. Другі прадугледжвае засваенне джаза ў тэарэтыка-практычным аспекце: азнаямленне з выканальніцкай практыкай лепшых майстроў сусветнага і беларускага джаза на навучальным аўдыё- і відэаматэрыяле.

Матэрыял, які прапануецца да вывучэння, падпарадкаваны акадэмічнай канцэпцыі і храналогіі развіцця джаза як віду музычнага мастацтва.

Самастойная работа студэнтаў складаецца з работы над канспектам лекцый; тэарэтычнай падрыхтоўкі да семінараў з выкарыстаннем метадычных і навукова-даследчых матэрыялаў; аналізу твораў джазавай музыкі.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Гісторыя сусветнага і беларускага джаза» адведзена 88 гадзін, з якіх 36 гадзін – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных заняткаў: лекцыі – 16, семінарскія – 20.

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Тэмы | Колькасць гадзін | |
|---|---|---|
| | лекцыі | семінар. заняткі |
| Уводзіны | 1 | |
| *Тэма 1.* Гістарычныя і сацыяльныя карані джаза | 1 | 2 |
| *Тэма 2.* Архаічны джаз (archaic jazz) | 2 | 2 |
| *Тэма 3.* Класічны джаз (classic jazz) | 4 | 4 |
| *Тэма 4.* Сучасны джаз (modern jazz) | 4 | 4 |
| *Тэма 5.* Развіццё джаза ў Расіі | 2 | 4 |
| *Тэма 6.* Развіццё джаза ў Беларусі | 2 | 4 |
| **Усяго…** | **16** | **20** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

### Уводзіны

Месца і роля дысцыпліны «Гісторыя сусветнага і беларускага джаза» ў падрыхтоўцы спецыяліста вышэйшай кваліфікацыі ў сферы мастацтва эстрады. Узаемасувязь са спецыяльнымі і прафілюючымі дысцыплінамі. Асноўная мэта і задачы дысцыпліны. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне.

### *Тэма 1. Гістарычныя і сацыяльныя карані джаза*

*Джаз* (англ. *jazz*) як від музычнага мастацтва, выканальніцкай дзейнасці музыкантаў, творчасці кампазітараў; від аркестра, ансамбля (джаз-банд, комба) і музычнай імправізацыі.

Джаз – тварэнне афра-амерыканскай музычнай культуры, унікальны сплаў элементаў афрыканскай і еўрапейскай музыкі. Гістарычныя і сацыяльныя карані джаза. Паўднёвыя штаты Амерыкі другой паловы XIV–XIX ст.

Афрыканскія карані джаза. Негрыцянскі музычны фальклор: працоўная песня (work song), абрадавая песня (ritual song), песня плантацый (holler song) – адны з найбольш ранніх жанраў афра-амерыканскага фальклору; спірычуэл (англ. *spiritual* ‘духоўны’), госпел (англ. *Gospel* ‘Евангелле’) – жанры негрыцянскай духоўнай музыкі. Прыкладны, функцыянальны характар музыкі амерыканскіх неграў. Стылістычныя асаблівасці негрыцянскай музыкі: імправізацыя, лабільнае інтанаванне, страфічнае вар’іраванне мелодыі, сінкопы, оф-біт, шаўт, граўл-эфекты і інш.

Еўрапейскія карані джаза: англа-кельцкія рэлігійныя рытуалы, пратэстанцкі харал (нем. *evangelisches Kirchenlied* ‘евангелічная царкоўная песня’), елізавецінская балада, форма «call and response», гімны, псалмы, менестрэльныя прадстаўленні, драматычныя спектаклі з музыкай, шырокае выкарыстоўванне фартэпіяна, дамашняе музіцыраванне.

### *Тэма 2. Архаічны джаз (archaic jazz)*

*Архаічны джаз* (англ. *archaic jazz*) – тэрмін і паняцце. Другая палова XIX ст. – 1900-я гг. – ранняя стадыя развіцця негрыцянскай інструментальнай музыкі. Новаарлеанскія духавыя аркестры.

Блюз, рэгтайм як пратажанры джаза. Мінстрэл-шоу і marching orkestra – першыя формы ўвасаблення архаічнага джаза.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Фартэпіянны стыль *бугі-вугі* як адна з найбольш ранніх разнавіднасцей негрыцянскага інструментальнага джаза.

Сацыяльна-гістарычныя передумовы нараджэння джаза. Збліжэнне і ўзаемаўплыў музычных культур неграў-нявольнікаў, крэолаў і белых перасяленцаў. Вызваленне музыкі ад прыкладных функцый і яе пераўтварэнне ў музыку для слухання (канцэртнае выканаўства), рост прафесіяналізму.

Стылявыя асаблівасці архаічнага джаза. Творчасць Бадзі Болдэна, Скота Джопліна, Фрэдзі Кепарда, Джэка «Папы» Лэйна і інш.

### *Тэма 3. Класічны джаз (classic jazz)*

*Класічны джаз* (англ. *classic jazz*) як тэрмін і паняцце. Перыяды развіцця класічнага (традыцыйнага) джаза. Эра свінга. Сацыяльныя передумовы распаўсюджвання і стылявыя асаблівасці класічнага джаза. Передумовы, якія спрыялі ўзнікненню джазавага буму. Вызначальныя асаблівасці стылю *свінг*.

Творчасць Луі Армстранга, Бікса Бейдэрбэка, Сіднея Бешэ, Каўнта Бэйсі, Бэні Гудмэна, Джоні Додса, Банка Джонсана, Глена Мілера, Джэлі Рол Мортана, Кінга Олівера, Бада Паўэла, Луіса Расела, Бэсі Сміт, Арта Тэйтума, Фрэнка Тэшамахера, Джэка Тыгардэна, Чыка Уэба, Флетчэра Хендэрсана, Білі Холідэй, Элы Фіцджэральд, Дзюка Элінгтана, джаз-ансамбля «Original Dixieland Jazz-Band» і інш.

### *Тэма 4. Сучасны джаз (modern jazz)*

*Сучасны джаз* (англ. *modern jazz*) як тэрмін і паняцце. Тры перыяды развіцця сучаснага джаза. Сацыяльныя передумовы, якія спрыялі ўзнікненню новых стыляў і напрамкаў сучаснага джаза. Вызначальныя асаблівасці сучаснага джаза.

Модэрн-джаз: бі-боп (боп), дыксіленд; кул-джаз, хард-боп (неа-боп), прагрэсіў, барок-джаз, соўл, фанкі, 3-я плынь. Аавангард: фры-джаз, новая хваля (new wave). Мадальны джаз: джаз-рок, ф'южн; эсід-джаз, джаз-рэп.

Творчасць Арта Блэйкі, Дэйва Брубэка, Вудзі Германа, Дызі Гілеспі, Дакстэра Гордана, Майлза Дэвіса, Стэна Кентана, Джона Колтрэйна, Орнета Коўлмэна, Чарлза Мінгуса, Фэтса Наваро, Чарлі Паркера, Мішэля Петручыяні, Оскара Пітэрсана, Джона Расела, Тэадора «Соні» Ролінса, Сэсіла Тэйлара, Пола Уайтмэна і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 5. Развіццё джаза ў Расіі*

Этапы развіцця джаза ў Расіі.

Сацыяльныя перадумовы, якія спрыялі ўзнікненню джаза ў Расіі. Папулярызатарская дзейнасць Сяргея Калбасьева, Аляксея Баташова, Уладзіміра Семаненкі, Уладзіміра Фейертага, Ігара Брыля і інш. Стварэнне расійскіх джаз-ансамбляў, творчасць савецкіх кампазітараў – Д. Шастаковіча, І. Дунаеўскага, Д. Пакраса, А. Цфасмана і інш.

Творчая дзейнасць джаз-аркестраў Алега Лундстрэма, Георгія Гараняна, Юрыя Саульскага, Юрыя Сіланцьева, Іосіфа Вайнштэйна, Мікалая Мінха; джаз-рок ансамбля «Арсенал» Аляксея Казлова; Санкт-Пецярбургскай джаз-філармоніі; джаз-тэатра Алега Кірэева; Адысея Багусевіча, Ігара Брыля, Давіда Галашчокіна, Вячаслава Ганеліна, Яўгена Геварняна, Мікалая Громіна, Вадзіма Людвікоўскага, Алекса Растоцкага, Крысціны Аглінц, Леаніда Чыжыка, Аркадзя Шылклопера і інш.

### *Тэма 6. Развіццё джаза ў Беларусі*

Этапы развіцця джаза ў Беларусі. Сацыяльныя перадумовы, якія спрыялі ўзнікненню джаза ў Беларусі. Творчасць дзяржаўнага джаз-аркестра пад кіраўніцтвам Эдзі Рознера. Кампазітарская дзейнасць Э. Рознера. Тэатралізаваныя джазавыя канцэрты. Кампазітары і аранжыроўшчыкі аркестра: Ю. Бяльзацкі, Л. Барумскі, Х. Надзель, Л. Марковіч.

Творчая дзейнасць аркестра пад кіраўніцтвам Барыса Райскага. Аркестры Белдзяржцырка і Белдзяржрадыё. Супрацоўніцтва з вядучымі кампазітарамі Беларусі: І. Лучанком, Я. Глебавым, Д. Смольскім і інш. Аранжыроўшчык А. Шпянёў.

Творчасць канцэртных музычных калектываў Белдзяржфілармоніі: «Арбіта- 67», «Тоніка», «Беларускі сувенір», «Лявоны». Пачатак творчай дзейнасці рок-гуртоў: «Алгарытмы», «Арганаўты», «Дойліды», «Залатыя яблыкі сонца», «Блікі», «Факіры» і інш.

Стварэнне дзяржаўнага канцэртнага аркестра пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга. Фарміраванне джаз-ансамбляў на базе аркестра. Адкрыццё кафедры мастацтва эстрады ў Мінскім інстытуце культуры. Падрыхтоўка прафесійных кадраў у галіне эстрады і джаза.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Творчасць джазавых гуртоў «Яблычны чай», «Беларускі дыксіленд», «Нік джаз-банд». Стварэнне прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь пад кіраўніцтвам В. Бабарыкіна.

Творчая дзейнасць С. Анцішына, А. Архіпава, А. Бурштэйна, Б. Бярнштэйна, У. Бялова, К. Гарачага, І. Капланава, А. Каліноўскага, М. Няронскага, І. Паліводы, А. Пыталева, А. Сапегі, І. Сафонава, І. Сацэвіча, У. Семянюка, А. Старажука, У. Ткачэнкі, У. Угольніка, М. Федарэнкі, У. Фельгіна, Д. Хаменкі, В. Шчарыцы, А. Шпянёва, В. Чайкова, А. Эскіна, В. Ямуцеева і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

*Бержеро, Ф.* История джаза со времен бопа / Ф. Бержеро, А. Мерлин. – М. : АСТ : Астрель, 2003. – 160 с.

*Верменич, Ю.* Джаз. История. Стили. Мастера / Ю. Верменич. – СПб. : Лань : Планета музыки, 2005. – 608 с.

*Кинус Ю.Г.* Джаз : истоки и развитие / Ю.Г. Кинус. – Ростов н/Д : Феникс, 2011. – 496 с.

*Кинус Ю.Г.* Из истории джазового исполнительства / Ю.Г. Кинус. – Ростов н/Д : Феникс, 2009. – 158 с.

*Коллиер, Д.* Становление джаза / Д. Коллиер. – М. : Радуга, 1984. – 390 с.

*Конен, В. Д.* Блюзы и XX век / В.Д. Конен. – М. : Музыка, 1980. – 81 с.

*Конен, В.Д.* Пути американской музыки : очерки по истории музыкальной культуры США / В.Д. Конен. – 3-е изд. – М. : Сов. композитор, 1977. – 446 с.

*Конен, В.Д.* Рождение джаза / В.Д. Конен. – 2-е изд. – М. : Сов. композитор, 1990. – 319 с.

*Минх, Н.* Джаз / Н. Минх // Музыкальная энциклопедия : в 6 т. – М. : Сов. энцикл., 1974. – Т.2. – С. 211–219.

*Озеров, В. Ю.* Джаз. США : учеб.-справ. пособие / В.Ю. Озеров. – М. : ГМПИ, 1990. – 159 с.

*Овчинников, Е.В.* История джаза : учеб. пособие / Е.В. Овчинников.– М. : Музыка, 1994. – Вып. 1. – 240 с.

*Панасье, Ю.* История подлинного джаза / Ю. Панасье ; пер. с фр. Л.Н. Никольской. – Л. : Музыка, 1979. – 128 с.

*Сарджент, У.* Джаз. Генезис. Музыкальный язык. Эстетика / У. Сарджент ; пер. с англ. М.Н. Рудковской, В.А. Ерохина. – М. : Музыка, 1987. – 294 с.

*Симоненко, В.* Лексикон джаза / В.Симоненко. – Киев : Муз. Украина, 1984. – 111 с.

*Советский* джаз. Проблемы. События. Мастера : сб. ст. / сост. и ред. А. Медведев, О. Медведева. – М. : Сов. композитор, 1987. – 591 с.

*Утесов, Л.О.* Спасибо, сердце! / Л. Утесов. – М. : Вигрус, 2000. – 363 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Фейертаг, В.* Джаз. XX век : энцикл. справ. / В. Фейертаг. – СПб. : Скифия, 2001. – 562 с.

*Дадатковая*

*Азарян, Д.* Джаз и фольклор / Д. Азарян // Сов. музыка. – 1985. – № 12. – С. 118.

*Барбан, Е.* Идея импровизации : развитие стиля в джазе / Е. Барбан // Родник. – 1990. – № 12. – С. 19–21.

*Гладков, Г.* Пути «третьего направления» / Г. Гладков // Музыкальная жизнь. – 1988. – №14. – С.2.

*Козлов, А.* Джаз, рок и медные трубы / А. Козлов // Огонек. – 1990. – № 29. – С. 20–23.

*Коллиер, Д.* Дюк Эллингтон / Д. Коллиер. – М. : Радуга, 1991. – 349 с.

*Коллиер, Д.* Луи Армстронг : Американский гений / Д. Коллиер. – М. : Прессверк, 2001. – 510 с.

*Конен, В.Д.* Третий пласт : Новые массовые жанры в музыке XX века / В.Д. Конен. – М. : Музыка, 1994. – 160 с.

*Конен, В. Д.* Современная музыка буржуазного Запада / В.Д. Конен. – М. : Знание, 1961. – 32 с.

*Конен, В.Д.* Этюды о зарубежной музыке : сб.ст. / В.Д. Конен. – 2-е изд. – М. : Музыка, 1975. – 479 с.

*Минх, Н.* Размышления о джазе / Н. Минх // Сов. музыка.– 1958. – № 2. – С. 42–43.

*Музыкальный* словарь Д. Гроува / Д. Гроув ; пер. с англ., ред. и доп. Л.О. Акопяна. – М. : Практика, 2001. – 1095 с.

*Печерский, П.* Психологические и социальные корни джаза / П. Печерский // Наука и техника. – Рига, 1968. – № 6. – С. 26–29.

*Переверзев, Л.* Джаз-банд / Л. Переверзев // Музыкальная энциклопедия : в 6 т.– М. : Сов. энцикл., 1974. – Т.2. – С. 219–220.

*Саймон, Д.* Гленн Миллер и его оркестр / Д. Саймон. – СПб. : Скифия, 2010. – 260 с.

*Саймон, Д.* Большие оркестры эпохи свинга / Д. Саймон. – СПб. : Скифия, 2008. – 616 с.

*Сапонов, М.А.* Искусство импровизации : импровизационные виды творчества в западноевропейской музыке средних веков и Возрождения / М.А. Сапонов. – М. : Музыка, 1982. – 77 с.

*Саульский, Ю.С.* Немного об эстрадных, джазовых составах и рок-музыке / Ю. Саульский // Книга о музыке. – 2-е изд. – М. : Сов. композитор, 1989. – 221 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Симоненко, В.* Мелодии джаза / В. Симоненко. – 2-е изд. – Киев : Муз. Украина, 1984. – 98 с.

*Уильямс, М.* Краткая история джаза / М. Уильямс // США : Экономика. Политика. Идеология. – 1974. – № 1.– С. 107–115, № 10. – С. 84–89.

*Шестаков, В.П.* Искусство тривиализации : некоторые теоретические проблемы «массовой культуры» / В.П. Шестаков // Вопр. философии. – 1982. – № 10. – С.105–116.

*Шестаков, Г.Ю.* Музыка в буржуазной «массовой культуре» : критические очерки / Г.Ю. Шестаков. – М. : Музыка, 1986. – 126 с.

*Энциклопедический* музыкальный словарь / сост. Б. Штейнпресс, И. Ямпольский. – М. : Сов. энцикл., 1966. – 632 с.

*Feather, L.* The encyclopedia of jazz in the sixties / L. Feather. – N.Y., 1966.

*Asriel, A.* Jazz. Analysen und Aspecte / A. Asriel. – Berlin : VEB Lied der Zeit Musikverlag, 1977.

*Hodeir, A.* Jazz : evolution and essence / A. Hodeir. – N.Y. : Grove press, 1958.

*Sargent, W.* Jazz : Hotend and Hybrid / W. Sargent. – N. Y. : Da capo press, 1975.

*Ulanov, B.* Histori of jazz in America / B. Ulanov. – N. Y. : TheViking Press ; London, 1959.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Дыскаграфія

DVD-video Кен Бернс «Джаз: вся история с 1917 г. по 2001 г.»
Производство США, Великобритания.
Прокатное удостоверение по СНГ W: 128011002 от 10.01.2006 г.

DVD-video «Глен Миллер»
Производство США.
Прокатное удостоверение по СНГ W: 128011001 от 10.01.2006 г.

DVD-video «Antonio Carlos Jo Bim»
Jazzvizion, 1989. PolyGram Records

DVD-video «Count Basie at Carnegie Hall»
Kultur 195 Hingway 36. West Long Branch, NJ 07764. www. Kultur.com

DVD-video «Benny Goodman farewell»
Collector`s Edinion 2003 tv Masters B.V.

DVD-video «Ella Fitzgerald. Something to live for»
Educational Broadcasting Corporation All Right Reserved
1999 Winstar TV & Video 419 Park Avenue South
New York. NT 10016

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Рэкамендаваныя сродкі дыягностыкі*

Для кантролю і самакантролю ведаў студэнтаў выкарыстоўваецца дыягнастычны інструментарый, які мае рознаўзроўневы характар і ўжываецца комплексна.

1. Творчыя заданні, якія прадугледжваюць эўрыстычную дзейнасць студэнтаў.

2. Пісьмовы аналіз твораў джазавай музыкі на матэрыяле музычных твораў розных стылявых напрамкаў джаза.

*Вучэбнае выданне*

**ГІСТОРЫЯ МАСТАЦТВА ЭСТРАДЫ**
**Раздзел 2. ГІСТОРЫЯ СУСВЕТНАГА**
**І БЕЛАРУСКАГА ДЖАЗА**

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках)*

Рэдактар А. І. Гутарава
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2013. Фармат 60х84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,80. Ул.-выд. арк. 0,43. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
ЛИ № 02330/0003939 ад 19.05.2011.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ